www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

20 мая 2005 года, № 11 (1919)

СВЯТЫ

## «І НАВАТ ДУМКІ НЕ БЫЛО, ШТО НЕ ПЕРАМОЖАМ...»

***6 мая ў нашым універсітэце адбыліся ўрачыстасці, прымеркаваныя да 60-годдзя з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Беларускі народ выстаяў дзякуючы мужнасці і намаганням тых, хто ваяваў на фронце, вёў падпольную барацьбу ў акупацыі, працаваў у тыле падчас вайны, і тых, хто аднаўляў краіну пасля вызвалення.***





Ушанаванне ветэранаў пачалося каля “стэлы памяці” са словаў падзякі абаронцам Айчыны, якія сказаў рэктар В.І. Стражаў. Павіншаваў удзельнікаў і старшыня Савета ветэранаў БДУ І.П. Зяцькоў. Святары адслужылі літыю па загінулых, пасля чаго ва ўсіх карпусах і аўдыторыях адбылася хвіліна маўчання. Афіцыйная частка свята завяршылася ўскладаннем кветак да стэлы. Дарэчы, гэты памятны знак быў усталяваны 7 мая 1975 г. да 30-годдзя Перамогі на сродкі, сабраныя супрацоўнікамі і студэнтамі БДУ. На ўрачыстым мітынгу з нагоды яго адкрыцця тагачасны рэктар У.М. Сікорскі адзначаў, што найлепшым манументам загінулым будуць поспехі моладзі ў вучобе і навуцы.



Сёлета ва універсітэцкім дворыку разгарнуўся сапраўдны ваенны гарадок. Дзве артылерыйскія гарматы (баявыя 122-міліметровыя гаўбіцы), грузавік з дзяржаўным сцягам, камандзірскія палаткі і, вядома, паходная кухня. У гонар свята ўрачыстым маршам прайшлі курсанты ваеннага факультэта. Ветэраны занялі ганаровыя месцы ў палатках, дзе для іх накрылі святочныя сталы. У канцэртнай праграме прынялі ўдзел творчыя калектывы БДУ. Духавы аркестр граў мелодыі і песні ваенных гадоў. І здавалася, што мы не ў 2005 годзе, а цяпер 45-ы, і ўсе ў гімнасцёрках.

Прыемна было назіраць радасць на тварах герояў: яны ведаюць і памятаюць цану той Перамогі. Многім з іх у 40-х ледзь-ледзь споўнілася 20 гадоў. Пра тое, што вяло іх наперад у тыя страшныя гады, распавяла Вольга Львоўна Пруднічэнка: “Жадаю моладзі, каб яны заўжды жылі ідэяй. Вы думаеце, чаму мы перамаглі? Я тады толькі скончыла 10 класаў, зусім дзяўчынкай была. І нават думкі не было, што мы не пераможам — так мы верылі! Былі патрыётамі, ваявалі за Радзіму. Хачу пажадаць моладзі большага пачуцця патрыятызму, любові да Радзімы, каб яны больш увагі надавалі і любілі свае сем’і”.

**Юлія ПІМЕНАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ і Аляксандра СНАПКА**



СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫНІКІ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КОМПЛЕКСУ БДУ ЗА 2004 ГОД — Стар. 2

У БДУ АБВЕШЧАНЫ КОНКУРС НА СУІСКАННЕ ПРЭМІЙ ІМЯ У.І. ПІЧЭТЫ І А.Н. СЕЎЧАНКІ — Стар. 2

У РУБРЫЦЫ «ПОМНІКІ БДУ» ЧЫТАЙЦЕ ПРА КІРЫЛУ ТУРАЎСКАГА



Стар. 4

БДУ АБ’ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2005 ГОД — Стар. 7

ПАДЗЕІ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ УНІВЕРСІТЭТА

Выставы, вечарыны — Стар. 8

## АБ'ЯВЫ

### АБАРОНА ДОКТАРСКІХ ДЫСЕРТАЦЫЙ

**20 мая 2005 г. у 10.00 у аўдыторыі 334 галоўнага корпуса адбудзецца абарона дысертацыі**

БРУЯ Ігара Мікалаевіча на тэму "Метады сумавання шэрагаў і класы функцый" на суісканне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

**20 мая 2005 г. у 14.00 у аўдыторыі 319 корпуса фізічнага факультэта адбудзецца абарона дысертацыі**

КАМАРОВА Аляксандра Фадзеевіча на тэму "Працэсы ўзаемадзеяння іонаў і электронаў з цвёрдымі целамі пры высакадозным і высокаэнергетычным апраменьванні" на суісканне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі**

### КОНКУРС НА СУІСКАННЕ ПРЭМІЙ ІМЯ У.І. ПІЧЭТЫ І А.Н. СЕЎЧАНКІ

***Да 85-годдзя заснавання БДУ і ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку прысуджэння прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі загадам рэктара №141-ОД ад 11.05.2005 г. абвешчаны конкурс на суісканне прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі.***

Прэмія імя У.І. Пічэты прысуджаецца ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, прэмія імя А.Н. Сеўчанкі — у галіне прыродазнаўчых навук навукоўцам Беларускага дзяржаўнага універсітэта за выдатныя дасягненні, якія ўключаюць:

навуковыя работы па перспектыўных напрамках, якія робяць значны ўнёсак у развіццё адпаведнай галіны навукі і тэхнікі;

стварэнне новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў;

работы па ашчаджэнні рэсурсаў і энергіі, абароне навакольнага асяроддзя і вырашэнне іншых важных для рэспублікі задач;

распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;

стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Электронныя варыянты загаду аб абвяшчэнні конкурсу, Палажэння аб парадку прысуджэння прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі знаходзяцца ў агульных (IMAP) папках на серверы БДУ. Гэтыя дакументы можна атрымаць праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню Від — Спіс папак адкрыць Агульныя папкі — Усе агульныя папкі — Галоўнае ўпраўленне навукі — Конкурс А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты.

**Матэрыялы, падрыхтаваныя ў адпаведнасці з Палажэннем, падаюцца ў Галоўнае ўпраўленне навукі БДУ з 23 мая 2005 г. да 3 мая 2006 г. (А.Г. Захараву, вул. Бабруйская, 9, пакой 418, тэл. 209-51-69, 209-54-27).**

**Галоўнае ўпраўленне навукі**

АФІЦЫЙНА

# ВЫНІКІ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КОМПЛЕКСУ БДУ ЗА 2004 ГОД

***На пасяджэнні Вучонага савета прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях У.З. Спірын выступіў з дакладам «Аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ за 2004 год». Па выніках абмеркавання, Вучоны савет прыняў рашэнне, якое мы і прапануем вашай увазе.***

## РАШЭННЕ

### Вучонага савета БДУ аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ за 2004 год

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад прарэктара па эканоміцы і інвестыцыях Спірына У.З. "Аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ за 2004 год", Вучоны савет Беларускага дзяржаўнага універсітэта адзначае, што ў 2004 годзе праца комплексу БДУ была накіравана на рэалізацыю заданняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, на павышэнне эфектыўнасці работы структурных падраздзяленняў універсітэта, стварэнне новых інавацыйных вытворчасцяў, паляпшэнне якасці падрыхтоўкі студэнтаў, развіццё навуковых даследаванняў і ўкараненне распрацовак у народна-гаспадарчы комплекс.

У выніку праведзенай працы заданні праграмы былі выкананыя ў поўным аб'ёме, а па некаторых паказчыках перавыкананыя.

У адпаведнасці з зацверджанымі накіраваннямі з рэспубліканскага бюджэту ў 2004 годзе БДУ і яго структурныя падраздзяленні прафінансаваныя ў памеры 70 629,0 млн рублёў, у тым ліку фінансавая дапамога ў памеры 2 592,4 млн рублёў, прадастаўленая універсітэту ў 2004 годзе распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 верасня 2004 года № 235рп "Аб кампенсаванні Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту і яго структурным падраздзяленням сум заплочаных падаткаў і мытных пошлін".

У 2004 годзе фактычныя выдаткі бюджэтных установаў БДУ склалі 67 650,4 млн рублёў, па пазабюджэтных паступленнях па комплексе БДУ — 76 348,9 млн рублёў, у тым ліку прыцягнутыя замежныя інвестыцыі ў памеры 3 348,2 тыс. еўра на будаўніцтва корпуса ФМА.

У 2004 годзе на арганізацыю навучальнага працэсу і правядзенне навуковых даследаванняў аб'ём фінансавання склаў 53 132,4 млн рублёў, што склала 78,5 % ад бюджэтных прызначэнняў комплексу БДУ.

У 2004 годзе ва універсітэце навучаліся 24 306 чал., што на 4 218 чал. менш у параўнанні з 2003 годам (змяншэнне на 14,8 %), у тым ліку значна зменшылася колькасць слухачоў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі — на 52 %, колькасць навучэнцаў зменшылася на 44,3 %. Колькасць студэнтаў у 2004 годзе склала 17 647 чал., што на 4,3 % больш у параўнанні з 2003 годам.

Сярэднегадавы кантынгент студэнтаў БДУ, якія навучаюцца на платнай аснове, у 2004 годзе склаў 6 153 чал., што на 656 чал. больш у параўнанні з 2003 годам (павелічэнне на 11,9 %).

Балансавы прыбытак арганізацый (прадпрыемстваў) комплексу БДУ склаў 4 202,5 млн рублёў.

Сярэдняя рэнтабельнасць па арганізацыях (прадпрыемствах, установах) комплексу БДУ склала 9,4 %.

Найбольш эфектыўна ў 2004 годзе працавалі рэспубліканскае навукова-вытворчае унітарнае прадпрыемства "Сейсматэхніка БДУ" (Аламліеў А.А.), установа адукацыі "Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ" (Брыгадзін П.І.), філіял БДУ "Дэпартамент эканомікі, інвестыцый, адукацыйных паслуг, прамысловага і экалагічнага сервісу" (Галавенчык Г.Г.), навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Унікаштмет БДУ" (Корзун Г.М.), унітарнае прадпрыемства "Канструктарска-тэхналагічны інстытут сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі" БДУ (Сенюць Т.Б.), беларуска-германскае сумеснае прадпрыемства "Радыё БДУ" (Ісачкіна Л.А.), вытворчае унітарнае прадпрыемства "Камбінат грамадскага харчавання БДУ" (Кандруцкі Ю.У.), рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Выдавецкі цэнтр БДУ" (Нічыпаровіч Т.Г.).

У 2004 годзе павялічылася пазабюджэтная выручка ад дзейнасці навукова-даследчых установаў універсітэта.

У справаздачным годзе былі ўкаранёныя ў вытворчасць навуковыя распрацоўкі і наладжаны выпуск запатрабаванай канкурэнтаздольнай, імпартазамяшчальнай прадукцыі. Значны ўнёсак зрабілі наступныя арганізацыі: доследна-вытворчае унітарнае прадпрыемства "Канструктарскае бюро спецыяльнай тэхнікі" БДУ, унітарнае прадпрыемства "Канструктарска-тэхналагічны інстытут сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі" БДУ, навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Санд", навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Актыў БДУ", вучэбна-навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Унітэхпрам БДУ", навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Уніхімпрам БДУ".

У 2004 годзе працягнуты работы па рэканструкцыі навучальна-лабараторнага корпуса юрыдычнага факультэта па вул. Ленінградскай, 8, работы па капітальным рамонце (будынак ваеннага факультэта з дапаможнымі памяшканнямі па вул. Маскоўскай, 5, будынак і збудаванні навучальна-спартыўнага комплексу па вул. Кастрычніцкай, 8, установка пажарнай сігналізацыі і сістэмы дымавыдалення ў інтэрнаце № 8 па вул. Крапоткіна, 51), таксама працягнуты работы па новым будаўніцтве аб'ектаў універсітэта (навучальна-лабараторны корпус факультэта міжнародных адносін, будынак навукова-навучальна-даследчага комплексу БДУ па вул. Кальварыйскай, 9). Уведзена ў эксплуатацыю другая чарга навучальна-гасцінічнага корпуса інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстановаў юстыцыі БДУ па вул. Савецкай, 14, здадзены ў эксплуатацыю будынак інтэрната № 2 па вул. Кастрычніцкай, 2, выкананыя работы па бягучым рамонце па аб'ектах універсітэта на суму 473,8 млн рублёў. У справаздачным годзе па даручэнні ўрада датэрмінова ўведзены ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс першай чаргі вытворчасці сінтэтычных алмазаў РУП "Адамас" БДУ, які складаецца з 120 апаратаў высокага ціску для сінтэзу алмазаў, выпушчана доследна-прамысловая партыя сінтэтычных алмазаў аб'ёмам 4000 каратаў.

Працягнутая праца па дзяржаўнай рэгістрацыі будынкаў і збудаванняў універсітэта, вызначэнні правоў карыстання зямельнымі ўчасткамі.

У 2004 годзе пачалася работа па рэарганізацыі структуры комплексу БДУ з мэтай удасканалення кіравання арганізацыямі (прадпрыемствамі) комплексу БДУ, аптымізацыі іх структуры, павышэння эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, якая знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні універсітэта. Выконваюцца мерапрыемствы па аптымізацыі структуры комплексу БДУ, прадугледжаныя рашэннем Вучонага савета БДУ ад 27 мая 2004 года, а менавіта: на базе ўстановы "Навукова-метадычны цэнтр "Электронная кніга БДУ" створаны аддзел інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння навучальнага працэсу ў Галоўным упраўленні вучэбнай і навукова-метадычнай работы, а само прадпрыемства было перапрафілявана ў Дзяржаўную ўстанову адукацыі "Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы" БДУ, закончаны працэс ператварэння Рэспубліканскага навукова-вытворчага унітарнага прадпрыемства "Сейсматэхніка БДУ" ў адкрытае акцыянернае прадпрыемства "Сейсматэхніка", даччынае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Інкас" уключана ў структуру БДУ з правамі юрыдычнай асобы, ліквідавана Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Медыцынскі цэнтр БДУ".

**Вучоны савет Беларускага дзяржаўнага універсітэта ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

**1.** Справаздачу аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ за 2004 год прыняць і зацвердзіць.

**2.** Зацвердзіць планы даходаў па факультэтах ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці на 2005 год.

**3.** Зацвердзіць асноўныя мэтавыя паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця арганізацый (прадпрыемстваў, установаў) комплексу БДУ на 2005 год.

**4.** Зацвердзіць нарматывы размеркавання і парадак выкарыстання сродкаў, атрыманых падраздзяленнямі (факультэтамі) універсітэта ад дзейнасці, якая прыносіць даходы.

**5.** Прыняць за аснову прыярытэт тавараў (работ, паслуг), якія вырабляюць (выконваюць, аказваюць) арганізацыі (прадпрыемствы, установы) комплексу БДУ, для забеспячэння ўнутраных патрэбаў універсітэта.

**6.** У мэтах далейшага ўдасканалення сістэмы кіравання арганізацыямі (прадпрыемствамі, установамі) комплексу БДУ, аптымізацыі іх структуры:

**6.1.** Далучыць:

— Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Гандлёвы дом БДУ" да навукова-тэхнічнага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Інкас" БДУ.

**6.2.** Ліквідаваць:

— Рэспубліканскае юрыдычнае унітарнае прадпрыемства "Прававы поліс" БДУ.

**7.** Упраўленню прававой работы (Швакава А.М.) забяспечыць прававое суправаджэнне ўнясенняў змяненняў у статутныя дакументы арганізацый (прадпрыемстваў) комплексу БДУ.

**8.** Забяспечыць у 2005 годзе ўвядзенне ў эксплуатацыю наступных аб'ектаў універсітэта:

— навучальна-лабараторнага корпуса юрыдычнага факультэта па вул. Ленінградскай, 8;

— навучальна-спартыўнага комплексу па вул. Кастрычніцкай, 8а;

— кацельні спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыганціна".

**9.** Забяспечыць у 2005 годзе працяг будаўніцтва, распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі, падрыхтоўку тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў для прыцягвання інвестыцый па наступных аб'ектах універсітэта:

— будаўніцтва будынка сацыяльна-культурнага цэнтра БДУ па вул. Ленінградскай, 12;

— заканчэнне выканання поўнага контуру будынка навукова-навучальна-даследчага комплексу БДУ па вул. Кальварыйскай, 9 і ўзмацненне нясучых канструкцый будынка згодна з праектнымі рашэннямі;

— будаўніцтва інтэрната БДУ на 1000 месцаў па прасп. Ф. Скарыны;

— рэканструкцыя будынка па вул. Аэрадромнай, 3а;

— заканчэнне будаўніцтва будынка "Крамы наглядных дапаможнікаў" па вул. Трасцянецкай з улікам перапрафілявання;

— рамонт спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыганціна" і інтэрната № 7.

**10.** Забяспечыць у 2005 годзе засваенне трэцяга транша крэдыту Байрышэхіпоферайнцбанка (Мюнхен, Германія) на будаўніцтва будынка факультэта міжнародных адносін.

**11.** На базе Дзяржаўнай установы адукацыі "Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій" БДУ (Апанасовіч У.У.) наладзіць сістэму перападрыхтоўкі кіруючых кадраў арганізацый (прадпрыемстваў, установаў) комплексу БДУ.

**12.** Упраўленню кадраў (Клімковіч А.Д.), Галоўнаму ўпраўленню эканомікі, камерцыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці (Петрышэнка М.М.) да 1 ліпеня 2005 года ўнесці прапановы па рэзерве кіруючых кадраў прадпрыемстваў з разліку не менш за дзве кандыдатуры на пасаду з улікам зменаў у кадравым складзе кіраўнікоў, якія адбыліся.

**13.** Упраўленню кадраў (Клімковіч А.Д.) да 1 лістапада 2005 года правесці атэстацыю дырэктараў і галоўных бухгалтараў арганізацый (прадпрыемстваў) комплексу БДУ.

**14.** Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Бандарэнка Я.Ф.), кантрольна-рэвізійнаму ўпраўленню (Курэйчык У.С.), Галоўнаму ўпраўленню эканомікі, камерцыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці (Петрышэнка М.М.) правесці праверку дзейнасці існуючых у структуры універсітэта цэнтраў (без правоў юрыдычнай асобы), філіялаў БДУ і да 1 лістапада 2005 года ўнесці на рэктарат прапановы аб мэтазгоднасці далейшага іх функцыянавання.

**15.** Ускласці персанальную адказнасць на прарэктараў, якія курыруюць структурныя падраздзяленні комплексу БДУ, па забеспячэнні належнага кантролю за:

— мэтавым выкарыстаннем бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў;

— выкарыстаннем аўтамабільнага транспарту ў адпаведнасці з вызначанымі лімітамі і мэтавым прызначэннем;

— выдаткамі на камандзіроўкі, тэлефонныя размовы, цепла-, вода-, энергазабеспячэнне, паслугі пабочных арганізацый;

— аказаннем платных адукацыйных і іншых платных паслуг.

**16.** Кантроль за выкананнем рашэння Вучонага савета ўскласці на прарэктараў па кірунках, якія яны курыруюць.

*28 сакавіка 2005 г.*

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## З ПАВАГАЙ ДА ВЕТЭРАНАЎ

3 мая ў галоўным корпусе БДУ прайшла навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта, прысвечаная 60-годдзю Вялікай Перамогі. Пачаў мерапрыемства лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар М.І. Юрчук. Ён прадставіў ветэранаў, якія прыйшлі на канферэнцыю: прафесар, выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта, Заслужаны дзеяч навукі Д.С. Умрэйка, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны З.В. Корж (дачка легендарнага партызанскага камбрыга В.З. Каржа), Герой Савецкага Саюза, камандзір батальёна беларускіх арлянят В.І. Ліvenцаў і ветэрана С.П. Харужая. Кожны з іх распавёў пра вайну і сказаў некалькі слоў-пажаданняў студэнтам.

З дакладамі выступілі студэнты ММФ, навучэнцы СШ № 67, а таксама студэнты з КНР, Сірыйскай Арабскай Рэспублікі і Туніскай Рэспублікі. Даклады былі падрыхтаваны па тэматыцы вайны: "Дзеці Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ", "Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза і лёс народаў свету", "Студэнты і выкладчыкі фізіка-матэматычнага факультэта БДУ — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны" ды інш.

Завяршылася канферэнцыя дыскусіяй па такіх праблемах, як "Вялікая Айчынная вайна вачыма майго пакалення", "Матэматыка ў час вайны і міру" і "Памяць і свята Вялікай Перамогі".

Юлія ПАПОВА

## НЕ СТАРЭЮЦЬ ДУШОЙ...

Ушанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны адбылося 27 красавіка ў музеі **юрыдычнага факультэта.** На сустрэчу з ветэранамі, якія працуюць і дагэтуль, вядомымі прафесарамі А.А. Галаўко, А.В. Дулавым, В.Ф. Чыгірам, С.Р. Драбязкам, М.Р. Юркевічам, Я.М. Тагуновым, В.Л. Прудніччна і інш. прыйшлі кіраўнікі і супрацоўнікі факультэта. Памяць студэнтаў-юрыстаў і выкладчыкаў, якія загінулі ў часе вайны, прысутныя ўшанавалі хвілінай маўчання. Каля мемарыяльнай дошкі ў гонар загінуўшых была выстаўленая ганаровая варта.

Студэнты факультэта падрыхтавалі для ветэранаў святочны канцэрт, які вялі студэнткі III курса Ганна Ціханская і Алеся Шуцько. Студэнты спявалі, танцавалі, чыталі ўласныя вершы. Ветэраны спявалі разам са студэнтамі і не хавалі слёз радасці. Асабліва парадаваў усіх сваім выступам прафесар Анатоль Аляксандравіч Галаўко, які граў на акардэоне, спяваў ваенныя песні. Пасля сустрэчы, якая доўжылася 4 гадзіны, ветэраны атрымалі кветкі і памятныя падарункі.

В.С. БРАНАВЕЦ,
старшыня Саюза жанчын юрыдычнага факультэта

ПАДЗЕІ

# ЕВАНГЕЛЛЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

***Важная падзея ў культурным жыцці краіны — прэзентацыя Евангелля ад Іаана ў перакладзе на сучасную беларускую мову адбылася 12 мая ў нашым універсітэце.***



Прэзентацыя праходзіла ва універсітэцкім гарадку ля помніка Францішку Скарыну — першаму беларускаму і ўсходнеславянскаму друкару, перакладчыку Біблii на беларускую мову.

Больш за 10 гадоў рабіўся пераклад Евангелля з царкоўнаславянскай на беларускую Біблейнай камісіяй Беларускай праваслаўнай царквы. У камісію ўваходзяць святары і навукоўцы. Трэба адзначыць, што цяпер перакладзены ўжо ўсе чатыры Евангеллі (ад Матвея, Лукі, Іаана і Марка), кожнае з іх выдадзена асобнай кнігай. Масавае выданне Святога Пісьма на роднай мове пакуль яшчэ не наладжана, таму прэзентаванае Евангелле лічыцца рэдкім і унікальным экзэмплярам.

У мерапрыемстве бралі ўдзел Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, рэктар БДУ В.І. Стражаў, член Міжнароднай Кірыла-Мяфодзіеўскай акадэміі славянскай асветы, мастак Генадзь Сухамлінаў ды іншыя шаноўныя госці.

На прэзентацыі гучала духоўная музыка ў выкананні вакальнай групы "Галант" пад кіраўніцтвам А. Гардзіенкі, хору "Пунсовыя ветразі" пад кіраўніцтвам У. Лоя і харавой капэлы БДУ (кіраўніца В. Мінянкова). Сваю праграму прапанаваў таксама клуб сярэднявечнай культуры "Калюмны". Тэматыцы мерапрыемства адпавядала і кніжная выстава "Сімвал лёсу Беларусі", прысвечаная асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны.

Прэзентацыя беларускамоўнага Евангелля прайшла ў межах Дзён беларускіх і ўсходнеславянскіх царкоўных дзеячаў і асветнікаў у БДУ.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ
Фотаздымак
Аляксандра СНАПКА

# ПАХОД З АБРАЗОМ БОЖАЙ МАЦІ

***Паход з абразом Казанскай Божай Маці па мясцінах баявой славы правялі студэнты Інстытута тэалогіі імя Святых Мяфодзія і Кірылы разам з курсантамі суворaўскага вучылішча 22—24 красавіка.***



Гэты абраз быў напісаны ветэранам Пятром Цітавічам Вастранковым у трох экзэмплярах. Адзін з іх быў перададзены Прэзідэнту Расіі У.У. Пуціну (зараз захоўваецца ў музеі на Паклоннай гары ў Маскве), другі падораны музею ў Германовічах Віцебскай вобласці, а трэці быў паднесены Прэзідэнту Беларусі А.Р. Лукашэнку (захоўваецца ў Свята-Духавым кафедральным саборы ў Мінску). Менавіта з беларускім абразом 40 навучэнцаў адправіліся ў вялікі паход — ад вёскі Ветрына да вёскі Шаркаўшчыны.

Удзельнікі акцыі прайшлі каля 80 кіламетраў, пабывалі ва ўсіх школах і музеях населеных пунктаў, праз якія яны праходзілі. Студэнты пераправляліся ўброд цераз ручаі і балоты, на сваe вочы бачылі месцы былых бітваў. Старажылы расказвалі ўдзельнікам акцыі ў падрабязнасцях пра ваенныя падзеі.

Аляксандр САЛАМАХІН

КАНФЕРЭНЦЫІ

# ПРАБЛЕМЫ ВАЙНЫ І МІРУ

***27 красавіка 2005 года на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ прайшла штогадовая навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў "Актуальныя праблемы сацыяльна-гуманітарных ведаў", прысвечаная 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.***

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел студэнты і аспіранты Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Латвійскага універсітэта, Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава, Духоўнай акадэміі імя Кірылы Тураўскага, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта. На пленарным пасяджэнні прагучалі даклады студэнтаў, прысвечаныя праблемам вайны, міжкультурнай камунікацыі ў сучасным свеце, адукацыі.

Праблема вайны выклікала вялікі даследчыцкі інтарэс з боку ўдзельнікаў канферэнцыі, якія рабілі даклады на самыя розныя тэмы, звязаныя з гэтым феноменам: ад тэмы вайны ў філасофскім дыскурсе, сучасных праблем вайны і міру да палітыкі ўлады ў сферы сацыяльнага забеспячэння ветэранаў.

На канферэнцыі працавалі 11 секцый, прысвечаных актуальным тэарэтыка-метадалагічным і практычным пытанням філасофіі, культуралогіі, этыкі, рэлігіязнаўства, сацыялогіі, псіхалогіі, камунікацыі. Адбылося таксама пасяджэнне круглага стала пад назвай "Міждысцыплінарныя даследаванні". Плённа працавала і адзіная англамоўная секцыя, дзе студэнты маглі не толькі прадэманстраваць уласныя навуковыя дасягненні, але і праверыць свае камунікатыўныя здольнасці ў замежнай мове.

Усе выступленні ўдзельнікаў суправаджаліся дыскусіямі, актыўным абмеркаваннем кожнага даклада, што надавала канферэнцыі нязмушаны характар і ствapала падмурак для далейшага інтарэсу студэнтаў да такіх мерапрыемстваў. Прыемна, што шмат для каго гэтая канферэнцыя стала першай спробай выявіць свае навукова-даследчыя здольнасці, адным з першых крокаў да вялікіх дасягненняў, з якіх і складаецца нялёгкі шлях у навуку.

Ірына ПАРХОМЕНКА,
студэнтка ФФСН

ПОСТФАКТУМ

## І ПАМЯТАЕ СВЕТ...

Вялікай канцэртнай праграмай "...І памятае свет ўратаваны" ўшанаваў Саюз жанчын БДУ на чале са старшынёй С.Р. Савінай ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Папярэднім адборам удзельнікаў на факультэтах займаліся члены Савета Саюза жанчын БДУ, а падрыхтоўкай канцэрта, яго арганізацыяй і каардынацыяй — старшыня Саюза жанчын юрыдычнага факультэта Валянціна Сцяпанаўна Бранавец.

Алеся ШУЦЬКО,
Ганна ЦІХАНСКАЯ,
студэнткі
юрыдычнага факультэта

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## СУСТРЭЧА НА БІЯЛАГІЧНЫМ

***У сценах біялагічнага факультэта 4 мая адбылася сустрэча былых і цяперашніх супрацоўнікаў, на якую завіталі 30 чалавек з ліку тых, хто прайшоў вайну. Для іх студэнты і супрацоўнікі факультэта наладзілі канцэртную праграму.***

Урачыстаму святкаванню Дня Перамогі папярэднічала напружаная праца: ветэраны адказвалі на анкеты, выкладчыкі і студэнты збіралі фотаздымкі ваенных і паваенных гадоў. Дзякуючы гэтаму была падрыхтавана камп'ютарная прэзентацыя, дзе кожнаму з запрошаных ветэранаў прысвячалася старонка з фотаздымкамі і пералікам некаторых фактаў біяграфіі. З афіцыйнымі віншаваннямі звярнуліся арганізатары свята дэкан факультэта У.В. Лысак, старшыня прафсаюзнага камітэта Н.М.Арол. З цёплымі словамі выступілі таксама А.С. Шуканаў, які шмат гадоў адпрацаваў дэканам факультэта, былая студэнтка В.К. Гаравец, якая з аднакурснікамі ў часе вайны ратавала лабараторнае абсталяванне.

Асаблівае захапленне ў удзельнікаў выклікаў памятны сувенір, які кожны атрымаў напрыканцы свята. Гэтым падарункам стала зробленая на пачатку вечарыны калектыўная фатаграфія, змешчаная ў прыгожую рамку.

З жалем развіталіся госці са сваімі калегамі, якія за многія гады сумеснай працы сталі аднoй сям'ёй.

У.В. ЛЫСАК,
дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт
А.Э. КАРАНЬКОЎ,
выкладчык кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслін

## КОНКУРСЫ

# СЛОВА, ШТО ІДЗЕ АД СЭРЦА

***Напрыканцы красавіка на філалагічным факультэце прайшоў Рэспубліканскі конкурс аратарскага майстэрства "Грамадзянскасць, слова, духоўнасць".***

Гэты конкурс аб'яднаў студэнтаў розных ВНУ Беларусі: БДУ, БДПУ імя М. Танка, Мінскага інстытута кіравання, Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна, Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава, ГрДУ імя Я. Купалы, Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта і інш. Асноўнай мэтай мерапрыемства стала спроба захаваць гістарычную пераемнасць пакаленняў, спрыяць павышэнню духоўнага ўзроўню і рытарычнага майстэрства моладзі.

На ўрачыстым адкрыцці конкурсу з прывітальнай прамовай выступілі прарэктар БДУ прафесар У.Л. Клюня, які адзначыў высокую грамадзянскую накіраванасць мерапрыемства, і старшыня аргкамітэта — дэкан філалагічнага факультэта прафесар І.С. Роўда.

У праграму ўвайшлі некалькі тураў конкурсу: дэкламацыя, падрыхтаваны выступ, дыскусія на пэўную тэму. Само спаборніцтва праводзілася ў два прыёмы за два дні. У музычным суправаджэнні конкурсу ўдзельнічалі аркестр "Светач" Беларускага дзяржаўнага інстытута культуры і мастацтва пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры духавой музыкі палкоўніка М.С. Жарко і лідэр гурта "Харлі" Я. Чалышаў.

Сярод удзельнікаў конкурсу былі студэнты ўсіх курсаў. Самымі маладымі канкурсантамі сталі навучэнцы юрыдычнага каледжа БДУ (А. Праскаловіч, К. Варславан, А. Мурашка і Н. Нябукіна), якія раней у сваёй навучальнай установе сталі прызёрамі прамоўніцкага спаборніцтва "Залатавуст—2004". Журы конкурсу на чале з прафесарам кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры БДУ Л.А. Мурынай уключала прафесійных выкладчыкаў культуры маўлення і рыторыкі (прафесар Мазырскага ДПУ В. Ф. Русецкага, ст. выкл. ГрДУ Г. М. Жданеню, дацэнтаў БДУ Т. У. Ігнатовіч, Т. У. Рубанік, С. А. Шантаровіч і інш.).

Ганаровымі дыпломамі пераможцаў былі адзначаны студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы Вольга Хацяневіч (дыплом І ступені за выступленне "Вытокі Перамогі — у духу народа"), студэнтка Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А.С. Пушкіна Алена Лук'янава (дыплом ІІ ступені за выступленне "Пераемнасць і духоўная повязь пакаленняў") і студэнт Мазырскага дзяржпедуніверсітэта Валянцін Бойка (дыплом ІІІ ступені за выступленне "Патрыятызм і культура міжнацыянальных дачыненняў"). Асобна — за палемічнае майстэрства — вызначаны быў прадстаўнік гістарычнага факультэта БДУ Дзмітрый Хабараў. У спецыяльнай намінацыі конкурсу — "За прыхільнасць нацыянальным традыцыям" — была адзначана і студэнтка філалагічнага факультэта БДУ Дзіна Гарбачова.

Лаўрэаты конкурсу атрымалі памятныя прызы, у тым ліку сувенірныя выданні Коласавай "Новай зямлі" і вырабы з нацыянальнай сімволікай. У другі дзень адбылася цікавая экскурсія.

Па выніках Рэспубліканскага конкурсу плануецца выданне зборніка выступаў, які зможа выконваць ролю практычнага дапаможніка-хрэстаматыі для жадаючых далучыцца да таямніц прамоўніцкага майстэрства.

**І.У. ТАЯНОЎСКАЯ**

## ПОМНІКІ БДУ

# Тураўскі залатавуст

***30 кастрычніка 2001 года ў дзень святкавання 80-годдзя БДУ адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка Кірылу Тураўскаму. Гэтая скульптура з'яўляецца трэцяй у Беларусі з прысвечаных нашаму славутаму земляку: першая — у епархіі Беларускай праваслаўнай царквы ў Мінску, другая — у Тураве. Аўтар універсітэцкага помніка — Аляксандр Прохараў. Бронзавая постаць славутага сына Беларусі стаіць на высокім гранітным пастаменце.***



XII стагоддзе ў Беларусі— далёкі ад нас час. Менавіта тады жыў выдатны рэлігійна-царкоўны дзеяч нашай краіны, красамоўны валадар пісьмовага і вуснага слова, асоба надзвычай яркая і магутная. Аўтар жыццяпісу святога Кірылы даволі скупы на факты біяграфіі: свецкае імя Кірылы невядома, даты нараджэння і смерці прыблізныя (каля 1130 — каля 1183 гг.). Ёсць меркаванне, што ён быў сынам заможных бацькоў. Манаскае імя Кірыла абраў у гонар Кірылы з Александрыі. Наш суайчыннік быў натхнёным валадаром слова, заслужыўшы ўжо ад сваіх сучаснікаў найменне другога Залатавуста. Па спадчыне, якая дайшла да нас ад Кірылы Тураўскага, можна ўпэўнена сказаць, што ён быў самым таленавітым творцам на землях усходніх славянаў у другой палове XII стагоддзя. Дакладная колькасць яго твораў невядома. Бясспрэчна ягонымі лічацца восем "Слоў" (або Павучанняў), 3 прытчы, каля 30 малітваў і некалькі канонаў.

З маленства Кірыла з адданасцю чытаў Святое Пісьмо і дасягнуў глыбокага разумення яго. Прыняўшы пострыг, ён прадэманстраваў выдатнае веданне твораў святых айцоў і набыў значны аўтарытэт сярод брацііі. Настаўнікамі Кірылы маглі быць, на думку гісторыкаў, святары-кніжнікі, што суправаджалі бібліятэку, якую прывезла з сабой у той час жонка Святаполка II, пераехаўшы пасля яго смерці ў Тураў. Кірыла (пра якога тады яшчэ ніхто і не думаў, што ён стане епіскапам Турава) быў шырока адукаваным чалавекам і ведаў грэчаскую мову, сярэднявечныя навукі, быў выдатным тэолагам, знаўцам Святога Пісьма, бездакорна валодаў паэтыкай, выпрацаванай візантыйскай літаратурай.

У жыцці Кірылы Тураўскага сказана пра матывы выбару манаскага шляху: "Не залюбіў... багацця і марнае славы гэтага свету, а рупіўся больш над вывучэннем Боскіх кнігаў і добра навучыўся Святога Пісьма". З жыцця таксама вядомы факт затворніцтва манаха Кірылы, якім ён "уславіўся ва ўсім краі тым". Простае манаства яго не задаволіла, і ён зачыніўся ў мураванай вежы-званіцы, абраўшы для сябе толькі чорны хлеб і сцюдзёную ваду, толькі чытанне Святога Пісьма і малітвы. Гэтак пачалося яго валадаранне над воляй, духам, целам. Такога ў Тураве, у Тураўскім княстве не бачылі, не ведалі.

У гэты перыяд свайго жыцця Кірыла Тураўскі напісаў "Сказанне пра манаскі чын ад Старога Запавету і Новага", "Аб подзвігу жыцця інака". У сваёй "Прыпавесці аб душы і целе" Кірыла Тураўскі ставіць злабадзённыя пытанні, якія датычаць узаемаадносінаў царквы і свецкіх уладаў. У творы ён абараняе неабходнасць адзінства Кіеўскай дзяржавы для стабільнага і спакойнага жыцця.

Каб сапраўды ўявіць сабе існаванне чалавека XII стагоддзя, трэба звярнуцца да падзей і з'яў таго часу. Кіеўская дзяржава ад часу свайго стварэння была ваенна-адміністратыўным аб'яднаннем мноства этнасаў. Уплыў Кіева не быў ні далёкім, ні глыбокім. Кіраванне з цэнтра абмяжоўвалася зборам даніны ды абавязковым удзелам у ваенных кампаніях кіеўскага князя.

З прыняццем хрысціянства на беларускіх землях паскорылася развіццё культуры, а разам з тым пашыраліся пісьмовасць і літаратура. Шырокія сувязі далучылі княствы да агульнаеўрапейскага працэсу. Полацк, Смаленск, Тураў становяцца аднымі з першых хрысціянскіх цэнтраў ва Усходняй Еўропе. Ужо ў X і XI стагоддзях тут з'яўляюцца епіскапскія кафедры. Распаўсюджваецца кірылічнае пісьмо. Граматай на той час валодалі жыхары буйных гарадоў, зямельных цэнтраў і нават аддаленых паселішчаў. Пры манастырах засноўваліся школы і бібліятэкі, ствараліся летапісы і кнігі. Манастыры станавіліся цэнтрамі культуры. Архітэктура таксама кардынальна змянілася: фарміравалася новае будаўнічае аблічча гарадоў, пачалі з'яўляцца мураваныя храмы. У параўнанні з драўлянымі дзядзінцам і пасадамі яны кардынальна змянілі архітэктуру гарадоў.

У 1132 г. пачаўся поўны распад Кіеўскай дзяржавы. Здаўна адасобленыя землі хутка пачалі пераўтварацца ў самастойныя княствы. Тураў уваходзіў у склад Кіеўскай зямлі, аднак ніколі не быў яе арганічнай часткай. Кіеў глядзеў на Тураў як на сваю воласць, і кіеўскі князь аддаваў яго свайму родзічу.

Тураўскія князі мяняліся адзін за адным. Гэтак было да 1158 г., калі тураўскі пасад самастойна заняў Юрый Яраславіч — унук Святаслава Ізяславіча, нашчадак добра вядомага тураўцам роду. Кіеў запатрабаваў ад яго пакоры, а калі князь не паслухаўся — рушыў на расправу. Да горада прыйшло вялізнае войска, дзе былі кіяўляне, смаленцы, галічане, лучане і нават палачане. Здавалася, гэтакая сіла можа захапіць невялікі Тураў. Аднак тураўцы ператварылі свой гарадок у непрыступную цвердзь. Дзесяць тыдняў доўжылася аблога, падчас якой абаронцы не толькі добра ваявалі на гарадскіх мурах, але і рабілі вылазкі на шкоду ворагу. І калі ў кааліцыйным войску пачаўся паморак коняў, яно мусіла зняць аблогу і сысці. Абараніўшы свайго князя, Тураў заваяваў незалежнасць. Юрый Яраслaвіч стаў першым князем мясцовай, тураўскай дынастыі.

Князь і жыхары горада праз Кіеўскага мітрапаліта запрасілі Кірылу, вядомага сваім падзвіжніцкім жыццём, стаць епіскапам Турава. Калі горад трымаў абарону супраць нападу Кіева, відаць, не толькі мужнасць дапамагала тураўцам выстаяць, але і прапаведніцкае і малітоўнае слова епіскапа Кірылы. Патрыёт свайго краю, ён так ніколі і не пакінуў тураўскіх межаў.

На епіскапскім пасадзе Кірылу даводзілася дбаць пра грамадска-палітычныя з'явы, але ўсё ж галоўнымі былі рэлігійна-царкоўныя: змены святароў, з'яўленне ератыкоў. Як вядома з жыція, Кірыла Тураўскі "епіскапа-ератыка Фядоркі ерась выкрыў... і пракляў яго". Водгуллем гэтых падзеяў стала напісаная ім "Аповесць пра сляпца і храмца".

Відавочна, Кірыла Тураўскі быў не толькі абстрактным маралізатарам: у сваім рэлігійна-асветніцкім настаўніцтве ён быў на самым лязе міжусобіцаў, якія раздзіралі яго Радзіму, ён верыў не толькі ў ідэю незалежнасці роднага княства, але і ў ідэю адзінства, якая зыходзіла з Кіева.

Так ці інакш, але спакойным жыццё святара Кірылы Тураўскага назваць дужа складана. Арыентаваны на духоўнасць, на кнігу (з яе мудрасцю і маральнасцю), на ўзор ідэальнага чалавека пад спрадвечнай дзясніцай Бога, Кірыла Тураўскі не прымаў подласці, зла і падману. Ад аскетычных малітваў ён пераходзіў да "Павучанняў", якія пісаліся на вялікія хрысціянскія святы. Самым значным з іх з'яўляецца Вялікдзень. У "Павучанні" Залатавуст так усхваляе свята, што робіць радасць вернікаў з нагоды ўваскрашэння Хрыста падобнай да веснавога абуджэння прыроды: "Цяпер вясна красуецца, ажыўляючы ўсё існае на зямлі: буйныя вятры, ціха веючы, памнажаюць плады, і зямля, сілкуючы насенне, родзіць зялёную траву. Вясна прыгожая — гэта вера Хрыстова, якая праз хрышчэнне абуджае да жыцця чалавечую прыроду, буйныя вятры — грахоўныя думкі, якія пакаяннем пераўтвараюцца ў дабрачыннасці і карысныя для душы плады памнажаюць; і зямля існасці нашай, слова Божае, як насенне, прыняўшы і пільнуючы ў сабе страх перад ім, заўсёды дух уратавання нараджае".

**Юлія ПІМЕНАВА,**
**Кацярына САМЕРСАВА**
**Фотаздымак**
**Аляксандра СНАПКА**

**Для падрыхтоўкі матэрыялу выкарыстана кніга А.А. Лойкі «Старабеларуская літаратура»**

ПОСТФАКТУМ

## ПАТРЫЯТЫЗМ ВАЧЫМА СТУДЭНТАЎ

28 красавіка кафедра англійскай мовы і маўленчай камунікацыі пры падтрымцы факультэта філасофіі і сацыяльных навук і факультэта журналістыкі нашага універсітэта правяла круглы стол на тэму “Вялікая Айчынная вайна як апагей патрыятызму беларускага народа”. Удзел у ім прынялі студэнты названых факультэтаў.

Даклады ўдзельнікаў раскрывалі паняцце патрыятызму: былі закрануты філасофскія і псіхалагічныя аспекты гэтай з’явы, абмяркоўваліся праблемы і прапанаваны методыкі даследаванняў патрыятызму ў сацыялогіі. На круглы стол быў запрошаны прафесар Рычард Кэніа, які чытае лекцыі ў рамках праграмы Фулбрайт.

Студэнты змаглі абмяняцца сваімі назіраннямі, меркаваннямі, вынікамі праведзеных даследаванняў, што паспрыяе развіццю і ўдасканаленню іх камунікатыўных здольнасцей, а таксама здольнасцей да асэнсавання складаных сацыяльна-філасофскіх праблем.

**П.Л. САЛАЎЁЎ,**
**старшы выкладчык кафедры англійскай мовы і маўленчай камунікацыі**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ЛЕПШАЕ ВУЧЭБНАЕ ВЫДАННЕ ГОДА

У 2004/05 навучальным годзе ў праграмы ВНУ ўведзены курс гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, накіраваны на патрыятычнае выхаванне моладзі. Цяпер кожны наш суайчыннік, які хоча мець дыплом аб вышэйшай адукацыі, будзе ведаць, як наша родная старонка сталася полем бітвы самай жорсткай і бесчалавечнай вайны ў гісторыі чалавецтва.

Супрацоўнікамі РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ» была праведзена сур’ёзная рэдактарская работа, дасканала выверааны даты, імёны і прозвішчы, арганізавана адпаведнае картаграфічнае забеспячэнне. Мастакі і мастацкі рэдактар натрапілі на правільную афармiцельскую ідэю. Гэтая ідэя была бліскуча ўвасоблена майстрамі камп’ютарнай вёрсткі. І вось вынік: на Рэспубліканскім конкурсе “Мастацтва кнігі — 2005” навучальны дапаможнік “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)” быў узнагароджаны спецыяльным дыпломам у намінацыі “Лепшае вучэбнае выданне”. Ганаровая адзнака сапраўднага дасягнення калектыву выдавецтва ёсць сведчаннем высокай кваліфікацыі ягоных працаўнікоў. Кожны студэнт БДУ можа ганарыцца тым, што выдатныя ва ўсіх дачыненнях кнігі ствараюцца ў сценах ягонай alma mater.

**Аляксандр ТРУШКО**

АКТУАЛЬНА

# БРСМ ТРЫМАЎ СПРАВАЗДАЧУ

***22 красавіка ў БДУ прайшла другая справаздачна-выбарчая канферэнцыя грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” БДУ.***



У праграму канферэнцыі ўваходзіла справаздача сакратара камітэта БРСМ нашага універсітэта Міхаіла Сіманюкова па рабоце арганізацыі за 2002—2004 гг., зацвярджэнне складу камітэта БРСМ БДУ, выбранне кантрольнай камісіі, дэлегаванне членаў арганізацыі для ўдзелу ў справаздачна-выбарчай канферэнцыі Маскоўскай раённай арганізацыі ГА “БРСМ”, выбары новага сакратара БРСМ БДУ, вызначаны кірункі работы арганізацыі на бліжэйшую будучыню.

На канферэнцыі прысутнічалі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў, намеснік дэкана фізічнага факультэта І.А. Саладухін, начальнік упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю П.В. Скалабан. Таксама на канфэрэнцыю былі запрошаны госці: сакратар ЦК ГА “БРСМ” А.Л. Бабіцкі, першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта ГА “БРСМ” С.В. Чыграй і першы сакратар ГА “БРСМ” Маскоўскага раёна Д.В. Ждановіч, намеснік начальніка ўпраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Беларусі Р.Ю Лабазнаў.

На канферэнцыю было дэлегавана 156 чалавек з усіх факультэтаў універсітэта. Па выніках галасавання сакратаром БРСМ БДУ быў абраны Аляксандр Лянкевіч.

На канферэнцыі была прааналізавана і прызнана задавальняючай работа арганізацыі за перыяд 2002—2004 гг., былі акрэслены задачы па ўдзеле арганізацыі ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў БДУ.

БРСМ БДУ сёння — гэта пярвічная арганізацыя з правамі раённага камітэта, якая аб’ядноўвае студэнтаў усіх факультэтаў універсітэта. Згодна з дакладам-справаздачай М.С. Сіманюкова, за два гады існавання арганізацыя БРСМ БДУ правяла значную сацыяльную работу, удзельнічала ва ўсіх агульнауніверсітэцкіх мерапрыемствах, праграмах, акцыях, супрацоўнічала са Студэнцкім саюзам, студгарадком і з усёй астатняй інфраструктурай універсітэта, арганізоўвала экскурсіі па Беларусі і за межы краіны. Пры камітэце БРСМ БДУ працуе Студэнцкі цэнтр занятасці, які дапамагае студэнтам у пошуку працы ў вольны ад навучання час.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота аўтара**

АКЦЫІ

# ДАРОГАМІ ПАМЯЦІ

***Напярэдадні Дня Перамогі студэнцкі актыў нашага універсітэта праехаў па мясцінах баявой славы. Арганізавалі гэтыя паездкі ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю і камітэт БРСМ. Моладзь наведала Брэст і Хатынь.***

### Музеі Брэста



Першае, што мы заўважылі, калі наблізіліся да Брэсцкай крэпасці-героя, гэта падрыхтоўку да свята: групы актывістаў, школьнікі, рабочыя падмяталі тратуары, фарбавалі бардзюры. Крэпасць сустрэла нас святочна і велічна.

Ідучы праз галоўны ўваход-зорку, адразу ж адчуваеш усю магутнасць крэпасці. Міжволі задумваешся пра суровы 1941 г., калі наша зямля вытрымлівала іспыт на мужнасць і трываласць.

Праз Холмскую браму мы прайшлі ў музей “Бярэсце”, дзе можна пазнаёміцца з старадаўняй гісторыяй горада. Пра яе распавядаюць рэшткі жылых і гаспадарчых пабудоваў.

Пасля заканчэння экскурсіі наша група наведала музей выратаваных мастацкіх каштоўнасцяў. Тут сабраная калекцыя твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, канфіскаваных супрацоўнікамі Брэсцкай мытні: абразы, рускі і заходнееўрапейскі жывапіс XVI—XX стст., графіка, вырабы са шкла, срэбра, бронзы, калекцыя мэблі.



Калі пабачыш распілаваныя абразы, з горыччу разумееш, што дзеля грошай некаторыя могуць пайсці на ўсё. І адчуваеш неабходнасць абараняць свае каштоўнасці, сваю гістарычную спадчыну. Вельмі сімвалічна, што такі музей размяшчаецца менавіта ў Брэсцкай крэпасці.

**Аляксей КАРЭНСКІ,**
**студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі**
**Фота аўтара**

### Хатынь

“Мінск — Хатынь — Курган Славы”. Такім маршрутам накіраваліся студэнты напярэдадні 60-годдзя Перамогі. Студэнцкі актыў змог у ліку першых экскурсантаў наведаць мемарыяльны комплекс “Хатынь” пасля рэканструкцыі. Студэнты наведалі музей, дзе размяшчаецца экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, агледзелі залу, прысвечаную ўсім спаленым вёскам, залу, якая паказвае гісторыю стварэння мемарыяльнага комплексу.

Нікога не пакінуў абыякавым расповед экскурсавода. Усклаўшы кветкі ў знак памяці загінулым, студэнты наведалі Курган Славы. Пакуль ідзеш па шматлікіх прыступках да велічнага помніка, задумваешся пра тых людзей, якія аддалі свае жыцці за Перамогу. Яны жывуць, пакуль мы памятаем пра іх.

**Святлана ДАЛГАНЮК**
**Фота аўтара**

БІРЖА ПРАЦЫ

## ДЗЕНЬ КАР’ЕРНАГА РОСТУ ДЛЯ ІТ-СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

***Напрыканцы красавіка ў БДУ прайшоў трэці штогадовы кірмаш вакансій для студэнтаў і маладых спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій.***

Гэтае мерапрыемства адбылося ў рамках ініцыятывы “Пакаленне прафесіяналаў”. Арганізатарам з’яўляецца Асацыяцыя распрацоўшчыкаў інфармацыйных тэхналогій “Нацыянальны інфапарк” разам з Белдзяржуніверсітэтам. Сёння Асацыяцыя мае партнёраў у Расіі, Латвіі і Літве, што значна пашырае магчымасці студэнтаў, якія жадаюць у будучым стаць ІТ-спецыялістамі. Галоўная мэта Дня кар’ернага росту — дапамагчы станаўленню беларускіх спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій і забяспечыць паспяховае працаўладкаванне студэнтаў ВНУ па іх спецыяльнасці праз праходжанне практыкі, супрацоўніцтва і далейшую сумесную працу з канкрэтнай кампаніяй-наймальнікам.

У тым, што нашых студэнтаў цікавіць іх будучае, не было ніякага сумневу, таму што падчас правядзення мерапрыемства ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ не было дзе яблыку ўпасці.

Кампаніі-ўдзельніцы Асацыяцыі прапанавалі студэнтам прэзентацыю сваёй дзейнасці, магчымасці супрацоўніцтва і павышэння кваліфікацыі на курсах і спецсемінарах. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 20 кампаній, сярод якіх такія буйныя, як ЗАТ “БелХардГруп”, “EpamSystems”, “ТопСофт”, “НавучСофт” і “РэдГрафікСістэмс”.

Пасля прэзентацыі студэнты маглі задаць любое пытанне прадстаўнікам кампаній у адкрытай дыскусіі. Больш за ўсё цікавіліся тым, як правільна скласці рэзюмэ: ІТ-спецыялісты шмат працуюць праз хатні Інтэрнэт і праверыць, ці правільна анкета запоўнена з пункту гледжання псіхалогіі і дакладнасці, не могуць.

**Юлія ПІМЕНАВА**

АБ’ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

загадчыка кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі;

старшага выкладчыка кафедры філасофіі культуры;

выкладчыка кафедры філасофіі і метадалогіі навукі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ

**аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

лабараторыя моцнатокавай электронікі

навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ВАЙНА Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Напярэдадні 9 мая на філалагічным факультэце прайшла Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Вялікая Айчынная вайна ў мастацкай літаратуры". Мерапрыемства адбылося на высокім навуковым узроўні: з 40 удзельнікаў 12 мелі прафесарскую ступень.

Адным з найцікавейшых быў даклад Заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі, дацэнта кафедры беларускай літаратуры і культуры В.В. Казловай. Яна распавядала пра ваеннае жыццё універсітэта. Пазней даследчыкі літаратуры ўсклалі кветкі да знакамітай сярод студэнтаў стэлы-"вінтоўкі", што знаходзіцца ў двары галоўнага корпуса. А ўвечары ветэранаў віншаваў тэатр філалагічнага факультэта, паказаўшы літаратурна-мастацкую кампазіцыю "Нам памяці звіняць званы па тых, хто застаўся навечна на скрыжаваннях вайны."

**Алена КРЫЎКІНА**

ПОСТФАКТУМ

## СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ

***Напярэдадні свята Перамогі ў чытальнай зале фундаментальнай бібліятэкі БДУ адбылася прэзентацыя кнігі Сяргея Трахімёнка "Рэха забытай вайны".***

Кніга ўключае апавяданні і аповесці пра людзей, якія на сваіх плячах вынеслі асноўны цяжар ваеннага часу. На прэзентацыі прысутнічаў аўтар. Сяргей Аляксандравіч — прафесар Інстытута нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук. Незнаёмую для большасці працу ў сферы дзяржбяспекі ён шмат гадоў спалучае з творчасцю: творы "Дэтэктыў на зыходзе стагоддзя", "Заказ на дваццаць пятага" выйшлі ў Маскве. У мінскіх выдавецтвах пабачылі свет кнігі "Гульні капрызнай паненкі", "Груз нябесны", "Жаночая логіка" і інш. Вядомы ён і як аўтар сцэнарыяў тэлефільмаў "Справа лейтэнанта Прыблагіна", "Эцьен", "Кент", "Апошні з групы "Джэк", "Спадарожнікі "Сатурна".

Многія лічаць яго творы дэтэктывамі, сам жа Сяргей Аляксандравіч у адным з інтэрв'ю сказаў: "Не лічу сябе дэтэктыўшчыкам. Я пішу прозу, загортваючы яе ў востры сюжэт".

У прэзентаваную кнігу ўвайшла аповесць "Belli puerri" (у перакладзе з латыні — "Дзеці вайны"), у аснову якой леглі ўспаміны людзей, што падлеткамі перажылі вайну і акупацыю Беларусі.

На сустрэчы госць таксама паказаў сваю новую работу — дакументальны фільм пра генерала Івана Данілавіча Чарняхоўскага, які кіраваў аперацыяй "Баграціён", вызваляючы ад акупантаў гарады і вёскі Беларусі.

**Аддзел гуманітарна-асветніцкай работы ФБ БДУ**

У ПРАФКАМЕ

# ЭКЗЮПЕРЫ Ў ПЕРАКЛАДАХ

***20 красавіка адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў агульнауніверсітэцкага конкурсу на лепшы пераклад сучаснай французскай прозы. Конкурс, арганізаваны кафедрай раманскіх моў, праходзіў пры падтрымцы пярвічнай арганізацыі студэнцкага прафсаюза.***

Каб дабрацца да фінішу, студэнты павінны былі прыняць удзел у двух турах. На першы з іх прыйшло 46 чалавек: такая колькасць жадаючых назіраецца ўпершыню за 4 гады правядзення конкурсу. Складанасцю другога тура было абмежаванне часу. За адну акадэмічную пару (1 гадзіну 20 хвілін) студэнтам трэба было перакласці з французскай мовы ўрывак з твору Антуана де Сэнт-Экзюпе645ы "Вольны лётчык". Пераклады былі самыя розныя, студэнт геаграфічнага факультэта Канстанцін Залатар здолеў зрабіць нават вершаваны.

За плённую працу студэнтам дасталіся падарункі. Ад прафсаюза пераможцы атрымалі касеты і камп'ютарныя дыскі з навучальнай праграмай па французскай мове, а таксама падручнікі па граматыцы і вусным паслядоўным перакладзе.



Першае месца заняў Аляксандр Сержановіч, які пераклаў твор на беларускую мову. Другое месца падзялілі Канстанцін Залатар, Павел Крывацэвіч, Ірына Мішчанка. На трэцім месцы апынуліся Ганна Слуцкая, Рамза Салсанаў, Дар'я Мельцэр, Валянціна Боган, Аляксандр Дзядзюра.

**Алена КРЫЎКІНА**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# БДУ ПЕРАМОГ У СПАРТАКІЯДЗЕ

***Спартакіяда "Здароўе" сярод супрацоўнікаў ВНУ краіны, прысвечаная 60-годдзю Перамогі, прайшла 23—24 красавіка на базе САК "Брыганціна". У спаборніцтвах прынялі ўдзел зборныя 6 універсітэтаў краіны, усяго больш за 160 удзельнікаў.***



Каманды спаборнічалі ў пяці відах спорту: плаванні, шахматах, настольным тэнісе, валейболе і міні-футболе. Самымі спартыўнымі паказалі сябе супрацоўнікі БДУ, якія занялі першае месца ў спаборніцтвах. Другой стала каманда БДПУ, трэцяй — БНТУ. Далей размясціліся зборныя БДУІР, БДЭУ і БДТУ. Па выніках спартакіяды ўдзельнікі і арганізатары вырашылі зрабіць яе штогадовай. Так што ў хуткім часе універсітэцкія аматары спорту маюць шанец сустрэцца зноў.

**Аляксандр САЛАМАХІН**
**Фота аўтара**

ГРАМАДЗЯНСКАЯ АБАРОНА

# ВУЧЭННІ ПРАЙШЛІ

***Згодна з планам штаба грамадзянскай абароны Маскоўскага раёна Мінска на пачатку красавіка ў нашым універсітэце адбылася командна-штабная трэніроўка па разгортванні пункта выдачы сродкаў індывідуальнай абароны (СІА) і зборна-эвакуацыйнага пункта (ЗЭП).***

Вучэбнымі задачамі трэніроўкі было ўдакладненне планаў прывядзення пункта выдачы СІА і ЗЭП у гатоўнасць да працы; удасканаленне навыкаў работы каманднa-начальніцкага складу па арганізацыі прыёму і адпраўкі эвакуіраваных у загарадную зону; практычная адпрацоўка персаналам пункта выдачы СІА і ЗЭП функцыянальных абавязкаў.

У вучэннях прынялі ўдзел 90 чалавек. Студэнты з групы аховы грамадскага парадку ваеннага факультэта БДУ на адзнаку "здавальняюча" выканалі практыкаванне па надзяванню процівагазаў. Добрымі выратавальнікамі паказалі сябе санітарныя дружыны геаграфічнага факультэта: яны вынеслі на насілках дзяўчынку, якая трапіла ў "зону атручвання". Усе запланаваныя мерапрыемствы ў рамках трэніроўкі прайшлі па плане, а іх удзельнікі ўдала справіліся са сваёй місіяй.

**Аляксандр САЛАМАХІН**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**



У ВОЛЬНЫ ЧАС

## ВЯЛІКІ СЛАВЯНСКІ ГЕНДЭР

Філалагічны факультэт мае шмат розных традыцыйных святаў — і "Міс Філфака", і "Кошыкбол", і "Аперацыя "Вязынка"... Але самай вясёлай і даўняй традыцыяй на нашым факультэце з'яўляецца "Славянскі вечар". Гэта адно з самых доўгачаканых, цікавых і запамінальных святаў у філалагічным асяродку. Сёлетні "Славянскі вечар" быў названы "Вялікім славянскім гендэрам".

На свяце прысутнічалі пасол Польшчы Тадэвуш Паўляк, пасол Чэхіі Уладзімір Румл, пасол Балгарыі Петка Ганчаў, а таксама прадстаўнік Украіны дарадца па справах культуры сп. Казлоўскі.

Увесь "Славянскі вечар" прайшоў бліскуча. Пра жаночыя гендэры спяваў выкладчык Андрэй Хадановіч сваю песню на трасянцы "Дзяўчонка з Беластока". Пад апладысменты ён працытаваў вершы "Стрыптыз" і "Дзяўчына са Ждановіч", пасля чаго атрымаў жвавы "Адказ дзяўчыны са Ждановіч Андрэю Хадановічу", які прачытала аўтарка Таццяна Нядбаева, студэнтка IV курса беларускага аддзялення.

Сапраўднай разынкай вечара было жывое супрацоўніцтва студэнтаў з выкладчыкамі філфака. Так, паланісты-трэцякурснікі з удзелам выкладчыцы па старaславянскай мове і іх асабістага куратара паставілі п'есу "Інтэрнат № 7", у якой паказалі фантастычна-ідэальнае жыццё студэнтаў-інтэрнатаўцаў.

Былі таксама нумары, поўнасцю прысвечаныя выкладчыкам. Так, студэнты І курса беларускага аддзялення паказалі п'есу "Галава прафесара Нормана, ці Норман без галавы", пасля якой паабяцалі да наступнага "Славянскага вечара" падрыхтаваць працяг гэтай п'есы аб спатканні дзвюх галоў прафесара Нормана.

А на заканчэнне "Славянскага вечара" быў прадстаўлены "смяротны" нумар — аднаполы секстэт: кафедральныя мача выканалі песню "Навукі юнакоў сілкуюць". Пасля такога нумара многія маглі пераканацца ў непраўдзівасці звестак, што філфак — жаночы факультэт і сапраўдны мужчына на ім вялікая рэдкасць.

**Таццяна КАСЦЮКЕВІЧ,**
**студэнтка ІІІ курса славянскага аддзялення**

КОНКУРСЫ

## ДЫЗАЙНЕРЫ З БДУ

Студэнты Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій (ДзІКСТ) БДУ прынялі ўдзел у міжнародным мастацкім конкурсе "АРТ-сесія", што адбыўся напрыканцы красавіка ў Віцебску. Двое з шаснаццаці ўдзельнікаў, якія прадстаўлялі ДзІКСТ, сталі пераможцамі. У намінацыі "Дызайн" перамог праект К. Апіцёнак, К. Клімовіч, К. Котавай, Н. Панцюхінай "Мастацтва новага часу?!!", а ў намінацыі "Медыя-арт" перамога дасталася Я. Грыпінскаму з праектам "Future archeology".

**Аляксей ФЁДАРАЎ,**
**студэнт ДзІКСТ**

АФІЦЫЙНА

# БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ аб'яўляе прыём у аспірантуру на 2005 год

**з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:**

**Механіка-матэматычны факультэт:** матэматычны аналіз; дыферэнцыяльныя ўраўненні; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка*; механіка дэфармаванага цвёрдага цела;

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** дыферэнцыяльныя ўраўненні; тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ВМ, комплексаў і камп'ютарных сетак; матэматычнае мадэліраванне, лікавыя метады і комплексы праграм; метады і сістэмы абароны інфармацыі;

**Фізічны факультэт:** тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка кандэнсаванага стану; фізіка паўправаднікоў; цеплафізіка і тэарэтычная цеплатэхніка; фізіка атамнага ядра; лазерная фізіка; біяфізіка;

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** прыборы і метады эксперыментальнай фізікі; радыёфізіка; фізічная электроніка; фізіка плазмы; інфармацыйна-вымяральныя і кіруючыя сістэмы; сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; элементы і прылады ВТ і сістэм кіравання; цвердацельная электроніка, радыёэлектронныя кампаненты, мікра- і нанаэлектроніка на квантавых эфектах;

**Хімічны факультэт:** неарганічная хімія; аналітычная хімія; арганічная хімія; фізічная хімія; высокамалекулярныя злучэнні; хімія высокіх энергій;

**Біялагічны факультэт:** біяхімія; мікрабіялогія; заалогія; фізіялогія і біяхімія раслін; фізіялогія; генетыка; экалогія; біятэхналогія;

**Гістарычны факультэт:** айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання;

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права;

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі;

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук:** сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры*; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; тэорыя і гісторыя культуры;

**Філалагічны факультэт:** беларуская літаратура; руская літаратура; літаратура народаў краін замежжа (з указаннем канкрэтнай літаратуры); тэорыя літаратуры, тэксталогія; беларуская мова; руская мова; славянскія мовы; тэорыя мовы*; прыкладная і матэматычная лінгвістыка; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі);

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка;

**Юрыдычны факультэт:** тэорыя і гісторыя права і дзяржавы, гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права*; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза, аператыўна-вышуковая дзейнасць; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; грамадзянскі працэс, арбітражны працэс; палітычныя інстытуты, этнапалітычная канфліктлогія, нацыянальныя і палітычныя працэсы і тэхналогіі;

**Геаграфічны факультэт:** фізічная геаграфія і біягеаграфія, геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія; геаэкалогія;

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі;

**Кафедра фізвыхавання:** тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры;

**без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:**

**Механіка-матэматычны факультэт:** матэматычны аналіз*; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка;

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** дыферэнцыйныя ўраўненні; тэорыя імавернасцяў і матэматычная статыстыка; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ВМ, комплексаў і камп'ютарных сетак; матэматычнае мадэліраванне, лікавыя метады і комплексы праграм;

**Фізічны факультэт:** оптыка; фізіка паўправаднікоў;

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** радыёфізіка; фізічная электроніка; сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі;

**Гістарычны факультэт:** айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання;

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права*; міжнароднае права, еўрапейскае права;

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі;

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук:** сацыяльная філасофія*; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры*; агульная псіхалогія, псіхалогія асобы, гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія*; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; тэорыя і гісторыя культуры*;

**Філалагічны факультэт:** беларуская літаратура; літаратура народаў краін замежжа (з указаннем канкрэтнай літаратуры); тэорыя літаратуры, тэксталогія; фалькларыстыка; беларуская мова; руская мова; тэорыя мовы*; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі);

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка;

**Юрыдычны факультэт:** тэорыя і гісторыя права і дзяржавы, гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння*; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальнае права і крыміналогія, крымінальна-выканаўчае права*; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза, аператыўна-вышуковая дзейнасць*; судовая ўлада, пракурорскі нагляд...адвакатура*; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права*; грамадзянскі працэс, арбітражны працэс*;

**Геаграфічны факультэт:** агульная і рэгіянальная геалогія; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія, геаэкалогія;

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі;

**Кафедра фізвыхавання:** тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры*.

* - мэтавая аспірантура

У аспірантуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы да 35 гадоў, якія маюць вышэйшую адукацыю і схільнасць да навуковых даследаванняў. Да ўступных экзаменаў у аспірантуру прыёмнымі камісіямі могуць быць допушчаны асобы, якія маюць досвед практычнай работы, і выпускнікі ВНУ толькі пры наяўнасці рэкамендацыі савета ВНУ (факультэтаў) пры ўмове высокага ўзроўню акадэмічнай падрыхтоўкі.

Асобы, якія раней прайшлі аспірантскую падрыхтоўку ў межах вызначанага тэрміну ці поўны курс знаходжання ў якасці суіскальніка вучонай ступені, не маюць права паўторнага навучання ў аспірантуры за кошт бюджэтных сродкаў.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру, здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, замежнай мове і філасофіі ў аб'ёме дзеючых праграм для вышэйшых навучальных установаў. З праграмамі можна пазнаёміцца на адпаведных кафедрах. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Перздача ўступных экзаменаў не дапускаецца.

Асобы, якія здалі цалкам ці часткова кандыдацкія экзамены згодна з вызначанымі патрабаваннямі, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсе. **Здача ўступнага экзамена па спецыяльнасці пры прыёме ў аспірантуру абавязковая.**

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара універсітэта **заяву вызначанага ўзору і дадаюць наступныя дакументы:**

— асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і 2 фатаграфіі (фатаграфіі павінны быць наклеены на асабісты лісток па ўліку кадраў і на экзаменацыйны ліст);

— спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач пра выкананыя даследаванні і распрацоўкі; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Навуковыя работы ці рэферат рэцэнзуюцца меркаваным навуковым кіраўніком з выстаўленнем адзнакі на адваротным баку экзаменацыйнага ліста;

— копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;

— ксеракопію працоўнай кніжкі (для працуючых) ці рэкамендацыю савета факультэта ВНУ. У рэкамендацыі Вучонага савета факультэта ВНУ павінна ўказвацца тэма дыпломнай работы ці магістэрскай дысертацыі, а таксама адлюстроўвацца ўдзел рэкамендаванага ў навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, наяўнасць у яго публікацый (артыкулаў, дакладаў), патэнтаў на вынаходніцтвы, грантаў, імянных стыпендый;

— ксеракопію пашпарта (стар.1, 31, 32, 33);

— два канверты з зваротным адрасам (для іншагародніх);

— хуткасшывальнік (кардонны);

— копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў).

Пашпарт, арыгіналы дыплома аб заканчэнні ВНУ і дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраваннях арганізацый, прадстаўляюць дадаткова накіраванні арганізацый.

**Прыём у аспірантуру з 20 чэрвеня па 10 верасня 2005 года.**

**Уступныя экзамены праводзяцца з 20 верасня па 15 кастрычніка 2005 г.**

***Залічэнне ў аспірантуру з 1 лістапада.***

Усім, хто паступае ў аспірантуру, перад першым уступным экзаменам па спецыяльнасці неабходна забраць у аддзеле аспірантуры экзаменацыйны ліст з пратаколам і пасля экзамена ў гэты ж дзень вярнуць іх у аддзел аспірантуры.

На наступныя экзамены (па замежнай мове і філасофіі) экзаменацыйныя лісты будуць накіроўвацца цэнтралізавана.

Усе, хто паступае ў аспірантуру, да 10 верасня павінны прайсці сумоўе з загадчыкамі кафедраў і меркаванымі навуковымі кіраўнікамі.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у аспірантуру, паводле іх заявы наймальнік абавязаны прадаставіць адпачынак без захавання заработнай платы для падрыхтоўкі і здачы ўступных экзаменаў.

На падставе вынікаў уступных экзаменаў і з улікам наяўных вакантных месцаў на конкурснай аснове прыёмная камісія выносіць рашэнне па пытанні аб залічэнні ў аспірантуру асоб, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены.

Аспірантам, якія навучаюцца з адрывам ад вытворчасці, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці — 3 гады, без адрыву ад вытворчасці — 4 гады.

Іншагароднім прадастаўляецца інтэрнат (без сям'і).

Выпускнікі магістратуры 2004 г. здаюць усе ўказаныя вышэй дакументы ў вызначаны тэрмін (да 10 верасня). Копіі дыплома магістра, дадатак да дыплома і рэкамендацыю савета факультэта ў аспірантуру пасля заканчэння магістратуры прадастаўляюць не пазней 1 кастрычніка гэтага года.

**Дакументы накіроўваць на адрас: 220050, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, БДУ, аддзел аспірантуры, тэл. 209-54-23, 209-51-73.**

Гэтыя ўмовы супрацоўнікі і студэнты БДУ могуць таксама атрымаць праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню Від—Спіс папак адкрыць Агульныя папкі — Усе агульныя папкі — Галоўнае ўпраўленне навукі —Аддзел аспірантуры.

КАНФЕРЭНЦЫІ

## БІЗНЕС-АДУКАЦЫЯ

*Напрыканцы красавіка ў нашым універсітэце адбылася IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя па праблемах бізнес-адукацыі.*

Арганізатарамі яе сталі Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ, Беларуская асацыяцыя бізнес-адукацыі. На канферэнцыі, у якой прынялі ўдзел 42 навукоўцы, былі заслуханы 14 дакладаў і паведамленняў прадстаўнікоў Беларусі, Расіі, Швецыі.

У рашэнні, прынятым на канферэнцыі, адзначаецца, што бізнес-адукацыя аформілася ў самастойную спецыфічную галіну на рынку адукацыйных паслуг. Удзельнікі канферэнцыі пастанавілі прасіць Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пры разглядзе Закону "Аб вышэйшай адукацыі" прадугледзець пры навучанні ў магістратуры разам з навукова-педагагічнай падрыхтоўкай магчымасць атрымліваць прафесійную адукацыю. Апрача таго, яны вырашылі звярнуцца ў Міністэрства адукацыі з просьбай павялічыць колькасць бюджэтных месцаў па спецыяльнасці "Бізнес-адміністраванне".

**У.У. АПАНАСОВІЧ,**
**дырэктар Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій, прафесар**

ПАДПІСКА — 2005

## "ВЕСНІК БДУ"

*Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:*

**Серыя I** — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень):
індывідуальная (індэкс 74851) – 7 490 р.;
ведамасная (індэкс 748512) – 17 949 р.

**Серыя II** — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік):
індывідуальная (індэкс 74852) – 7 490 р.;
ведамасная (індэкс 748522) – 17 949 р.

**Серыя III** — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад):
індывідуальная (індэкс 74853) – 14 990 р.;
ведамасная (індэкс 748532) – 35 899 р.

**Серыя IV** — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань):
індывідуальная (індэкс 74854) – 14 990 р.;
ведамасная (індэкс 748542) – 35 899 р.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4), у кіёску "Універсітэцкая кніга" (вул. Кастрычніцкая, 2), у кнігарні "Акадэмічная кніга" (прасп. Незалежнасці, 72, тэл. 232-00-52); серый 3, 4 — у кіёску па вул. К. Маркса, 31 (будынак гуманітарных факультэтаў БДУ).

**Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс — гэта падпіска!**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**Рыхтуемся да экзамену па беларускай мове.** Вучэбна-метадычны дапаможнік змяшчае рознаўзроўневыя тэсты па беларускай мове, складзеныя ў адпаведнасці з Праграмай уступных экзаменаў для тых, хто мяркуе паступаць у БДУ.

**Синтаксис и пунктуация: Практикум для абитуриентов.** *Автор-составитель Т.Л. Протасовицкая.* Дапаможнік падае разнастайныя практыкаванні, арыентаваныя на паўтарэнне і замацаванне ведаў і ўменняў па сінтаксісе і пунктуацыі рускай мовы.

*Д.С. Умрейко, Т.А. Дик, А.П. Зажогин, А.И. Комяк, В.В. Сытько.* **Спектры и структура комплексов уранила.** У манаграфіі падагульняюцца вынікі арыгінальных даследаванняў з прыцягненнем літаратурных звестак у адносінах да фізічнага абгрунтавання сучасных метадаў спектральна-структурнага аналізу комплексаў пераходных элементаў на прыкладзе злучэнняў шасцівалентнага урану (так званага уранілу).

*Л.А. Ванштейн.* **Теория восприятия.** Курс лекцый падрыхтаваны ў адпаведнасці з навучальнай праграмай дысцыпліны "Эрганоміка і тэорыя ўспрымання" з улікам сучасных дасягненняў псіхалагічнай навукі.

*В.М. Юрин.* **Биомедиаторы в растениях.** Асноўная задача курса лекцый — пашырыць і паглыбіць веды студэнтаў пра значэнне біямедыятараў і іх ролю як сігнальных рэчываў і пасрэднікаў у раслінах.

**Вузовская наука, промышленность, международное сотрудничество: сборник научных трудов.** У зборніку падаюцца навуковыя артыкулы па шырокім коле пытанняў, якія ахопліваюць развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў у ВНУ, міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхналогій, новыя адукацыйныя тэхналогіі, праблемы абароны інтэлектуальнай уласнасці і інш. Працы былі прадстаўлены на V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая адбылася 13—15 кастрычніка 2004 г. у Мінску.




*М.Г. Лукашевич, А.А. Мазаник, Д.А. Скрипка.* **Изучение гальваномагнитных явлений.** У метадычных указаннях да спецпрактыкуму "Фізіка паўправадніковых матэрыялаў" разглядаюцца залежнасці асноўных гальванамагнітных з'яў (эфект Хола і магнітарэзістыўны эфект) ад напружанасці магнітнага поля ў дыямагнітных і магнітаўпарадкаваных асяроддзях.

**Танах и мировая культура.** *Автор-составитель Г.В. Синило.* У выданні выкладаецца праграма навучальнай дысцыпліны, звязанай з вывучэннем яўрэйскага Святога Пісьма — Танаха (Старога Запавету хрысціянскай Біблії).

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## ВЫСТАВЫ

# КАБ СВЕЧКА НЕ ПАГАСЛА



"Гэты мастак шчаслівы ў сваёй творчасці. Ён нікога не паўтарае, ён ні на каго не падобны і адкрыў ужо не адзін, а мноства ўласных сусветаў... Яны, быццам вясёлка, звязваюць зямлю і неба, цела і душу, пранікаюць у свядомасць глядача, жывуць у яго ўяўленні."

Менавіта такімі словамі адкрылася выстава жывапісу вядомага беларускага мастака Генадзя Сухамлінава 25 красавіка ў рэктараце БДУ. Майстар назваў выставу "Каб свечка не пагасла" і прысвяціў яе адразу тром падзеям: нядаўняму юбілею Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, светламу святу Вялікадня і, канечне, знамянальнай даце ў гісторыі нашай краіны — 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. На цырымоніі адкрыцця выставы прысутнічалі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх ўсяе Беларусі Філарэт, рэктар БДУ В.І. Стражаў, а таксама ганаровыя госці.

Генадзь Сухамлінаў нарадзіўся ў Віцебску, дзе скончыў мастацка-геаграфічны факультэт педагагічнага інстытута. Сярод яго настаўнікаў — вядомыя мастакі Фелікс Гумен, Іван Сталяроў, Леанід Анцімонаў. Па прафесіі Генадзь Сухамлінаў — педагог. Ён паспяхова сумяшчае творчую працу з педагагічнай дзейнасцю: больш за 30 гадоў выкладае ў розных навучальных установах.

Яго работы добра вядомыя ў нашай краіне і за мяжой: з 1977 года Сухамлінаў актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выставах. Многія работы мастака знаходзяцца ў прыватных калекцыях ЗША, Германіі, Аўстрыі, Польшчы, Ізраіля і Англіі. У 1994 г. ён стаў членам Беларускага саюза мастакоў.

Палотны, прадстаўленыя на выставе (нацюрморты, пейзажы і партрэты), аб'яднаны адной агульнай тэмай — тэмай духоўнасці. Быццам пранізаныя сонечным святлом, карціны Генадзя Сухамлінава "Падзяка", "Дарога", "Вяртанне", "Аўтапартрэт. Пятая запаведзь Божая", "Радзіма" і інш. нясуць ідэі дабра і любові да ўсяго свету. Менавіта за духоўнасць яго твораў і за любоў да славянскай культуры Генадзь Сухамлінаў быў прыняты ў Міжнародную Кірыла-Мяфодзіеўскую акадэмію славянскай асветы.

"Прадстаўленыя на ваш суд карціны, — кажа майстар, — адлюстроўваюць увесь мой творчы шлях і маё разуменне жыцця і мастацтва. Я — мастак-рэаліст. Прыгажосць знаходжу ў паўсядзённым жыцці і выяўляю яе самымі простымі сродкамі. Я імкнуся данесці да людзей высокія ідэі духоўнасці, бо няма нічога лепш, чым жыць па запаветах Божых, у гармоніі з сабой, людзьмі і прыродай".

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота аўтара**

# КУЛЬТУРА І ТРАДЫЦЫІ ЯПОНІІ

***Адкрыццё выставы "Культура і традыцыі Краіны ўзыходзячага сонца" адбылося 13 мая ў будынку рэктарата. Арганізатарам мерапрыемства выступіў Саюз жанчын БДУ.***

На адкрыцці прысутнічалі часовы паверэны ў справах Японіі ў Беларусі сп. Марына Юсіда і сакратар па справах культуры спн. Ханада Тамока, рэктар нашага універсітэта прафесар В.І. Стражаў, старшыня Саюза жанчын БДУ С.Р. Савіна, члены Савета Саюза жанчын БДУ.

На выставе можна пазнаёміцца з тым, як выглядае японская кухня, пабачыць кампазіцыі лялек, вясельныя і летнія кімано, посуд для чайнай цырымоніі, а таксама 8 дыярам, якія рэпрэзентуюць японскую культурную спадчыну.

**Паводле інфармацыі Саюза жанчын БДУ**
**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**




## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ГАРБАТА ПА-РУСКУ



"Рускі чай" — гэта не проста духмяны напой, назва гарбаты або салодкія абаранкі. Гэта цікавыя сустрэчы замежных навучэнцаў факультэта daўніверсітэцкай адукацыі. Такія "святкаванні" звычайна адбываюцца двойчы на год — увосень, калі будучыя студэнты з усходніх і паўднёвых краін толькі знаёмяцца, і ўвесну, калі яны паказваюць набытыя за гэты час уменні, далучаюцца да традыцый Беларусі і Расіі (адсюль — " Рускі чай"). Гэтым разам "гарбата" была асаблівa адказнай, складанай для замежных студэнтаў, бо прысвяцілі яе 60-годдзю Перамогі: пра ўдзел беларусаў у той вайне замежнікі ў большасці сваёй даведаліся, толькі прыехаўшы ў Беларусь.

Святкаванне адкрыў рэктар БДУ В.І. Стражаў, пажадаўшы замежным "гасцям" поспехаў у далейшым навучанні. На пляцоўку выйшлі замежныя студэнты і прывіталі гледачоў па-беларуску. У гэты вечар усе гутарылі на рускай і беларускай мовах. Асабліва незвычайна гучалі знаёмыя песні: здаецца, ты іх разумееш, але такога вымаўлення яшчэ не чуў. Вечар узбагаціў замежных навучэнцаў новымі ўражаннямі.

**Алена КРЫЎКІНА**
**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

20 мая 2005 года
Падпісана да друку 19.05.2005 г.
Зак. 437. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 2
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by